...ЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ! 7 СЬНЕЖНЯ 1931 г. № 281 (1550)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

Крывавы тэрор пілсудчыкаў—новае зьвяно ў ланцугу вайсковай падрыхтоўкі супроць краіны Саветаў

Да працоўных усяго сьвету, да салдат усіх буржуазных армій

(З адозвы ЦК КПП)

Таварышы

Узмоцненым тэмпам працуе ў фашысцкай Польшчы катаўская машына ваенна-палявых судоў. Штораз часьцей перад гэтымі судамі становяцца рабочыя і сяляне, а прыгавор гэтых судоў адзін—**Сьмерць праз павешаньне.**

Шпаркімі тэмпамі ўся Польшча, Заходняя Украіна і Заходняя Беларусь пакрываецца лесам шыбеніц. Перад гэтымі судамі, у гэтых шыбеніцах польская буржуазія і яе ўрад—урад фашысцкай дыктатуры Пілсудзкага—шукаюць збро́і барацьбы з узрастаючым рэвалюцыйным рухам рабоча-сялянскіх мас і нацыянальна-вызваленчай барацьбой прыгнечаных народаў з КПП—правадыром і арганізатарам пролетарскай рэвалюцыі ў Польшчы.

4 сьнежня ваенна-палявы суд у Петракове будзе судзіць рабочых—**Яна Малецкага і Сьцяпана Закшэўскага**, арыштаваных у Тамашове Мазавецкім **на мітынгу, скліканым пад лёзунгам абароны СССР.** Польская фашысцкая прэса піша: з „з прычыны таго, што абвінавачаным пагражае кара сьмерцю, у петракоўскай турме падрыхтавана шыбеніца, якая не ўжывалася на працягу раду апошніх гадоў".

27 лістапада Пілсудзкага арганізаваў масавае забойства, павесіўшы **ў Баранавічах** (Заходняя Беларусь) **сямёх чыгуначнікаў**, засуджаных на сьмерць па абвінавачаньні ў шпіянажы на карысьць СССР.

28 лістапада за гэтае самае **кат Пілсудскі павесіў у Чарткове** (Заходняя Украіна) **Яна скарупку-Яворскага. У Львове** засуджан на сьмерць украінец **Дачышын** па абвінавачаньні ў нападзе на пошту пад Бобркай.

У крывавых лапах Пілсудзкага ваенна-палявыя суды, задачай якіх зьяўляецца тэрарызаваць рабочых і сялян, фізычна зьнішчыць рэвалюцыйны лягер Польшчы, сталі ўжо ня толькі з роям барацьбы з рэвалюцыйным рухам у межах Польшчы. Ваенна-палявыя суды Пілсудзкага маюць яшчэ адну задачу: яны зьнішчаюць у Польшчы па Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі кожнае праяўленьне сымпатыі да СССР, кожную спробу барацьбы з антысавецкай інтэрвэнцыяй, якую падрыхтоўвае польскі імпэрыялізм і яго міжнародныя, асабліва французскія, саюзьнікі і пратэктары. Барацьба супроць ваенна-палявых судоў у Польшчы зьяўляецца такім чынам справай не толькі пролетарыяту і працоўнага сялянства Польшчы.

Барацьба з ваенна-палявымі судамі ў Польшчы зьяўляецца справай працоўных мас усяго сьвету, бо для іх справай зьяўляецца абарона СССР перад капіталістычным сьветам.

Таварышы!

Ваенна-палявыя суды ў Польшчы таму масава зьнішчаюць сёньня рабочых і сялян, што **падзеі ў Манчжурыі адкрываюць новыя перспэктывы для ваенных пляноў Пілсудзкага.** Міжнародны капітал, а разам з ім і польскі капітал спадзяюцца на тым, што Савецкі Саюз дазволіць сябе справакаваць вайну з Японіяй, якая па-бандыцку напала на Кітай і пагражае Кітайска-Усходняй чыгунцы, што знаходзіцца пад савецка-кітайскім кіраўніцтвам.

„Польская справа вырашыцца на палёх Манчжурыі"—піша вядомы пілсудчык Мацкевіч і крычыць: „Ура Японіі!" Уторыць яму другі фашыст Студніцкі, пішучы: „Калі японская зброя зьнішчыць бальшавіцкую Расію, дык мы будзем благаслаўляць гэту зброю так, як благаслаўлялі перамогу Японіі над царызмам у 1905 годзе".

Але яшчэ мацней за прэсу крычаць факты аб тым, як **падзеі ў Манчжурыі ажывілі антысавецкую палітыку фашызму і яго падрыхтоўку да вайны.**

З трыбуны Лігі нацый міністар Залескі ізноў фальшывыя словы аб мірных тэндэнцыях Польшчы ў адносінах да СССР, з якім Польшча нібыта хоча падпісаць пакт аб ненападзе. Пры гэтым, аднак, ён не ўспамінае ні слова аб тым, што зараз-жа пасьля нападу Японіі на Манчжурыю Пілсудзкі паехаў у Будапэшт, каб там з румынскім штабам закончыць пляны супольнага нападу на СССР. Масавыя забойствы, пры дапамозе ваенна-палявых судоў, рабочых і сялян—клясавых ворагаў польскай буржуазіі і саюзьнікаў СССР—зьдзіраюць маску з ашуканчых мірных фраз фашысцкага ўраду, зьяўляюцца яркай адзнакай узмоцненай падрыхтоўкі да ўзброенай інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу.

Таварышы!

Рэволюцыйныя масы Польшчы пад кіраўніцтвам КПП вядуць шырокую кампанію супроць ваенна-палявых судоў, як супроць абвостранай зброі фашысцкага тэрору, як супроць новага зьвяна ў ланцугу ваеннай падрыхтоўкі супроць СССР. У гэтай кампаніі яны ганьбяць пазыцыю правадыроў ППС, якія на словах нібыта супроць тэрору, а ў сапраўднасьці дапамагаюць Пілсудзкаму-вешальніку ў яго барацьбе з рэволюцыйным рухам (у яго падрыхтоўцы ўзброенага нападу на СССР.

Вашым абавязкам, які вынікае ня толькі з пачуцьця клясавай салідарнасьці, але і патрэбы супольнай абароны СССР, таксама зьяўляецца выступленьнем **з масавымі протэстамі супроць пагрозы сьмерцю для Малецкага і Закшэўскага і наогул супроць разгулу ваенна-палявых судоў у фашысцкай Польшчы.**

Арганізуйце магутныя мітынгі протэсту! Маніфэстуйце ў кожнай краіне перад пасольствам і консульствамі Пілсудзкага, перад польскімі фашысцкімі ўстановамі за граніцай!

На барацьбу за жыцьцё Малецкага і Закшэўскага!

На барацьбу супроць ваенна-палявых судоў у Польшчы, як аднэй з прылад падрыхтоўкі інтэрвэнцыі супроць СССР!

На абарону СССР!

Цэнтральны камітэт комуністычнай партыі Польшчы.

Варшава, сьнежань 1931 г.

Хваля мітынгаў протэсту і абурэньня

Патрабуем вызваліць політвязьняў

* * *

8-тысячны атрад пролетарыяту—рабочыя-чыгуначнікі вагона-рамонтнага заводу „Полымя рэволюцыі"—патрабуе ад фашысцкага ўраду Польшчы зараз-жа вызваліць з турмы Малецкага і Закшэўскага, зьняць сьмяротныя прыгаворы, спыніць ваенна-палявыя суды. вызваліць усіх політвязьняў!

У знак братэрскай салідарнасьці з рабоча-сялянскімі масамі Польшчы мы адлічаем палову процанта месячнай зарплаты ў фонд дапамогі 10 000 палонынікаў польскага фашызму.

Прэч рукі ад жыцьця Малецкага і Закшэўскага!

Рабочыя „Дрэваапрацоўшчыка", заслухаўшы інформацыю аб павешаньні 7 чыгуначнікаў у Баранавічах, рашуча протэстуюць супроць зьверстваў фашысцкіх інквізытараў.

—У адказ на крывавую оргію фашызму, мы, рабочыя мэханічнага цэху заводу „Дрэваапрацоўшчык", пастанаўляем адпрацаваць 3 гадзіны на карысьць політвязьняў белапанскай Польшчы і выклікаем пасьледваць нашаму прыкладу ўсе заводы і фабрыкі Менску.

Прэч крывавыя рукі пільсудчыкаў ад рэволюцыйнага руху ў Польшчы, Заходняй Беларусі і Украіны!

Да пленуму ЦК ЛКСМБ

Соцыялістычныя кадры—на важнейшых вучастках

Тысячны атрад комсамольцаў вучэбнага комбінату 5-га эксплёатацыйнага раёну ў адказ на загад т. Андрэява і пастанову Кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б) аб чыгуначным транспорце, узяў на сябе рад конкрэтных абавязкаў.

20 асоб студэнтаў-комсамольцаў абслугоўваюць сець тэхнічнай і політычнай асьветы на Гомель-цэнтральная, МК грузчыкаў, МК руху і МК кандуктароў.

Комсамольскі камітэт камбінату організаваў кантрольныя пасты па маршрутызацыі на Гомель-пасажырчая, Гомель-цэнтральная і Унеча. 26 комсамольцаў студэнтаў працуюць па маршрутызацыі цягнікоў.

Устаноўлены кругласутачныя дэжурствы. Выпрацавана форма вучоту работы комсамольцаў-студэнтаў. 30 студэнтаў эксплёатацыйнага тэхнікуму вылучаны ў Жлобінскі і Унечкі раёны на ліквідацыю прарыву ў руху.

Каб правесьці ў жыцьцё дырэктывы партыі аб павялічэньні сутачнай работы паравозаў мінімум на 1 гадзіну організаваны кантрольныя пасты на 9 вучастку цягі: па аналізу работы паравоза і выяўленьню яго карыснай працы, па гаспразрахунку паравоза, па плянавай працы, па энэргетыцы па эканоміі апалу, па высьвятленьню экіпіровачных элемэнтаў і інш.

На дапамогу вытворчым ячэйкам Гомельскага вузла ў рэалізацыі загаду т. Андрэява вылучаны 5 брыгад з 15 асоб.

К 14 гадавіне Кастрычніка, з удзелам комсамольцаў вучэбнага комбінату, адрамантаваны паравоз.

Сэкратар комсамольскага камітэту вучэбнага комбінату 5-га эксплёатацыйнага раёну. **ВАСІН**

Гомель.

Мастацтва, вартае пэрыяду соцыялізму

фоне бязьлітаснай клясавай ...бы ў нашай краіне, на фоне ...нага пераможнага соцыялістыч... наступу, на фоне вялізарнага ...рнага росту мас працоўных,—...чайнае політычнае значэньне ...ае першая ўсебеларуская пар... нарада па пытаньнях мастацтва, якая сёньня распачынае сваю ...у.

...ада дасьць глыбокі бальшавіцкі ...фронту мастацтва ў БССР ...начыць далейшыя шляхі баль... ...кіх перамог на яго адказьнейшых ...тках.

...ада абгаворыць пытаньні ба... ...ы за вялікае мастацтва бальша... ...-пытаньні барацьбы за соцыялізм ...адказьнейшых галін мастацтва, ...мадзейнае мастацтва, тэатр, кіно, ...аўскі рух, выяўленчае мастац...

...ада, бязумоўна, прыкуе да ...пільную ўвагу нашай пролетар... ...рамадзкасьці і зьявіцца магут... ...ым вагаром у справе разгорт... ...я далейшай барацьбы за нацыя... ...ую па форме і пролетарскую ...месту культуру.

...тацтва ва ўмовах дыктатуры ...отарыяту, ва ўмовах жорсткай ...ай барацьбы закліканы быць ...й зброяй партыі ў ажыцьцяў... ...е генэральнай лініі, у ажыць... ...ньні задач разгорнутага соцыя... ...нага наступу.

...ак, гэтая надзвычайна пачэсная ...эная задача, гэтае вымаганьне ...е клясы да пролетарскага ...цтва выконваецца ў цэлым ...яго галін яўна не дастаткова, ...і не здавальняюча.

...сёнешняга стану пролетарскага ...цтва БССР, ня гледзячы на яго ...рэчны ідэёвы і творчы рост, ...ктывізацыю ў нашым эгульным ...е, характэрна ў той-жа час ...е адставаньне ад бурных тэм... ...оцыялістычнага будаўніцтва.

...ачы ліквідацыі адставаньня ад ...ых тэмпаў соцбудаўніцтва ...аюць барацьбы за консалідацыю ...олетарскага мастацтва, патра... ...дамагчыся актыўнага, соцыя... ...нага супрацоўніцтва ўсіх галін ...цтва, баявога ажыцьцяўленьня ...азаньняў т. Сталіна. Трываласьць, ...онсалідацыі дасьць магчымасьць ...нуць яшчэ больш рашучую ...ьбу супроць правага і „левага" ...унізму ў мастацтве, супроць ...дзяржаўнага шовінізму, праяў ...рэволюцыйнага нацыянал-дэмо... ...зму і іншых клясава-варожых ...тэорый" і „тэорыяк" на фронце ...цтва. Гэта дасьць магчымасьць ...нуць больш бязьлітасную ба... ...у з усялякімі вульгарызатарамі, ...істамі, меншавіцтвуючым ідэалі... ...лефронтаўцамі, пераверзаўцамі, ...шмат яшчэ і ў галіне тэатру ...ш. галінах мастацтва)—за чыс... ...марксысцка-ленінскай тэорыі ...стацтве, за авалоданьне мэтодам ...ктычнага матэрыялізму.

...інскі комсамол, які за апош... ...ды значна павысіў свой удзел ...ынальна-культурным будаўніцтве, прыходзіць да партнарады, з конкрэтнымі, рэальнымі вынікамі сваёй работы на асобных вучастках „пролетарскага мастацтва.

У гэтых адносінах комсамол мае значнае дасягненьне ў разгортваньні трамаўскага руху. У радзе гарадоў працуюць ТРАМы. ТРАМ сьмела і мужна ўзьнімае сьцяг мастацкага агітпропу комсамолу, заваёўваючы аўторытэт у гушчах комсамолі і ўсёй працоўнай моладзі. Аднак разгортваньне трамаўскага руху, які ўяўляе вышэйшую ступень самадзейнага мастацтва, яшчэ недастатковае. Трэба рашучым чынам мацаваць першыя перамогі ТРАМаўскага руху, трэба ўключыць ТРАМ у разгорнутую барацьбу за аўладаньне дыялектыка-матэрыялістычным творчым мэтодам. Трэба дабіцца палепшаньня кіраўніцтва трамаўскім рухам, забясьпечыць ўвагу да яго ўсёй пролетарскай грамадзкасьці.

У той-жа час, калі комсамол мае пэўныя вынікі ў разгортваньні трамаўскага руху, у барацьбе за пролетарскі тэатр, дык барацьба комсамолу за пролетарскую кінематографію, за пролетарскую музыку—яўна недастатковая, а падчас зусім нязначная. Яшчэ ў цэлым радзе галін мастацтва комсамольскія організацыі зусім не бяруць патрэбнага ўдзелу.

Наша кіно-вытворчасьць ні колькасна ні якасна не адпавядае пэрыяду уступленьня у соцыялізм. Перад кінэматографіяй вялізарнай важнасьці задача яго соцыялістычнай рэконструкцыі.

Кіно-вытворчасьць яшчэ не павярнулася тварам да комсамолу і мас працоўнай моладзі. Процант комсамольскай тэматыкі ў кіно-фільмах яшчэ надзвычайна мізэрны. У той-жа час трэба канстатаваць і другі бок справы: комсамол надзвычайна не дастаткова павярнуўся тварам да задач пролетарскай кінэматографіі. Зусім зразумела, што такое становішча на далей не цярпіма.

Комсамол павінен прыняць актыўнейшы ўдзел у барацьбе за стварэньне пролетарскай кінэматографіі. Узяцца у сур'ёз за падрыхтоўку кадраў. дамагчы разгортваньню заклiку ўдарнікаў у кіно, змагацца за якасьць кіно-вытворчасьці, супроць працягваньня у кіно усялякіх буржуазных тэндэнцый і г. д.—неадкладныя задачы комсамольскае барацьбы за пролетарскае кіно-мастацтва. У гэтых адносінах неабходна выкарыстаць вопыт агульна-маскоўскай кіно нарады комсамолі.

Комсамолія павінна ўключыцца ў барацьбу за соцыялістычную рэконструкцыю цырку, павесьці барацьбу супроць штукарства, пошласьці, шаблёну. За поўнацэннае політычнае відовішча.

Партыйная нарада, бязумоўна, скажа сваё слова аб удзеле комсамолу ў барацьбе за пролетарскае мастацтва, аб удзеле ва ўсіх яго галінах.

Першай усебеларускай партыйнай нарадзе па пытаньнях мастацтва—баявое комсамольскае прывітаньне!

Партыя напярэдадні ўсесаюзнай парт-конфэрэнцыі

...часу XVI партзьезду пройдзен ...ейшы гістарычны этап. Пар... ...дабілася за гэты пэрыяд вялі... ...йшых посьпехаў, няўхільна ...дзячы соцыялістычны наступ ...сім фронце. СССР зьяўляецца ...рушальным аплотам, базай ...сьветнай рэвалюцыі. І калі пось... ...нашай першай пяцігодкі вык... ...оць вялізарнейшае захапленьне ...іх прыхільнікаў, рэволюцыян... ...юць пролетарскія масы, падвесяц... ...ь іхнія сілы ў барацьбе з ка... ...ам, дык якое-ж магутнае ўзь... ...ічаньне зробіць наша другая ...годка, якая будзе будавацца на ...чаным фундаманце соцыялі... ...най экономікі.

...нарадах для XVII партконфэ... ...ыі цэнтральным камітэтам пас... ...ны пытаньні аб другой пяці... ...і справаздачны даклад ВСНГ ...СС аб рабоце прамысловасьці ў 19.. годзе і аб пэрспэктывах на 19.. год.

...1931 годзе прамысловасьці давялася працаваць у цяжкіх умовах. Адна з асноўных прычын невыкананьня ёю пляну—той удар, які нанёс прамысловасьці мінулай зімы чыгуначны транспорт.

...менш важнай прычынай ...ваньня прамысловасьці зьяві... ...няўменьне большасьці гаспадарнікоў перабудаваць сваю работу, улічваючы новыя ўмовы, новую гаспадарча-політычную абстаноўку ў краіне.

У гістарычнай прамове т. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў 23 ліпеня 1931 г. былі ўскрыты асноўныя прычыны адставаньня прамысловасьці. У тых галінах прамысловасьці, на тых прадпрыёмствах, дзе па-бальшавіцку ўзяліся за праявядзеньне ў жыцьцё 6 умоў т. Сталіна, ужо дасягнут пералом.

Па-бальшавіцку ўскрыць усе недахопы і прарэхі у рабоце прамысловасьці, дамагаючыся поўнага правядзеньня ў жыцьцё 6 умоў т. Сталіна, забясьпечыць мобілізацыю ўсіх унутраных рэсурсаў самой прамысловасьці, разгарнуць сапраўдную барацьбу за прамфінплян, за якасныя паказчыкі прамысловасьці, забясьпечыць бальшавіцкую падрыхтоўку выкананьня пляну 1932 году—важнейшая задача партыйных конфэрэнцый, якія будуць праводзіцца.

Выходным момантам, які вызначае абрысы другой пяцігодкі, зьяўляецца той факт, што мы заканчваем у бягучым годзе пабудову фундаманту соцыялістычнай эканомікі, што мы ўжо прышлі ў асноўным да завяршэньня суцэльнай колектывізацыі ў асноўных збожжавых раёнах і ў асноўным завяршаем суцэльную колектывізацыю па ўсім СССР у 1932-33 годзе, што перамога соцыялізму СССР ўжо забясьпечана.

Адпаведныя імпэрыялістычныя колы вельмі схільны шукаць выхад з крызісу шляхам новай вайны, у першую чаргу супроць СССР. Аднак ва ўмовах моцнага ўздыму нашага соцыялістычнага будаўніцтва, ва ўмовах жорсткага крызісу і нарастаньня элемэнтаў рэволюцыйнага ўздыму ў капіталістычных краінах, напад на СССР становіцца ўсё больш небясьпечнай і рызыкоўнай авантурай для саміх нападаючых.

Партыя дабілася буйнейшых посьпехаў соцыялістычнага будаўніцтва ў няўстаннай барацьбе з опортунізмам, з усялякімі адхіленьнямі ад ленінскай лініі. Калі пытаньне „хто-каго" вырашана і ў прамысловасьці і ў сельскай гаспадарцы—мяняюцца формы супраціўленьня лішкаў капіталістычных элемэнтаў, мяняюцца намеры опортуністых. Буржуазныя тэндэнцыі ў особных саўгасах, правыя кулацкага ўплыву ў некаторых колгасах спробы абмануць пролетарскую дзяржаву, сарваць пляны хлебанарыхтовак—такавы новыя, характэрныя формы супраціўленьня клясавага ворага.

Барацьба за прамфінплян 1932 году і за плян другой пяцігодкі патрабуе ленінскай бальшавіцкай непрымірымасьці да ўсялякіх ухілаў ад генэральнай лініі партыі, што ідуць як па лініі праваопортуністычнага супраціўленьня высокім тэмпам соцыялістычнага будаўніцтва, так і па лініі „левацкага" пражэкторства. Партыя ідзе згуртаванымі радамі да XVII партыйнай конфэрэнцыі.

Вынікі трэцяга, рашаючага году пяцігодкі гавораць, што ня гледзячы на цяжкасьці, пяцігодка будзе ня толькі выканана, але і перавыканана ў 4 гады ў 1932 годзе. Другая пяцігодка будзе новай перамогай генэральнай лініі партыі, новай гістарычнай ступеньню на шляху да перамогі пролетарыяту ва ўсім сьвеце.

(Скарочаная перадавая з „Праўды" па радыё).

Усебеларускі партнарадзе па мастацтву—комсамольскае прывітан

Вялікай эпосе-вялікае бальшавіцкае мастацтв

РУШЫМ КОМСАМОЛЮ НА АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ НА ЎСІХ ВУЧАСТКАХ ФРОНТУ МАСТАЦТВА

ТРАМ'ы—комсамольскі рух на фронце будаўніцтва пролетарскага тэатру

ТРАМ'ы—ударная брыгада комсамолу на фронце тэамастацтва

Артыкул тав. Шамшура

У 1929-30 годзе ў БССР пачаў разгортвацца ТРАМ'аўскі рух—комсамольскі рух на фронце самадзейнага тэатру. Да партнарады па пытаньнях мастацтва, мы маем у БССР 4 ТРАМы (Менск-2, Віцебск-1 Гомель-1) 5 ТРАМ'ядраў на буйных прадпрыемствах Менску, Віцебску і Гомеля (ТРАМ'ядро—гэта пярвічная ячайка ТРАМ'руху). Рабочая моладзь раду гарадоў і прадпрыемстваў БССР уздымае пытаньне аб організацыі ТРАМ'аў, Сёньня ўжо трэба вырашаць пытаньне аб організацыі польскага ТРАМ'у, аб організацыі колгасных ТРАМ'аў.

Трамаўскі рух—„следствие" жаданьня рабочай моладзі паставіць мастацтва на службу соцыялістычнага будаўніцтва, рэакцыя незадавальненьня зьместам работы самадзейных мастацкіх гурткоў, імкненьне работу самадзейнага тэатру перавесьці на вышэйшую ступень.

ТРАМы знаходзяцца ў сыстэме комсамолу. Уся работа ТРАМ'аў павінна быць падпарадкавана соцбудаўніцтву, трамаўцы павінны быць ударнай брыгадай комсамолу на фронце тэамастацтва. 2 гады разгортваньня ТРАМ-руху ў БССР паказалі, што нашы ТРАМы сапраўды зьяўляюцца мастацкімі агітпропамі комсамолу, Тэмы, якія ТРАМы распрацоўвалі і распрацоўваюць зараз вынікаюць з асноўнага, што стаіць сёньня перад комсамолам Беларусі. ТРАМ'ы БССР распрацоўвалі наступныя тэмы ў сваіх спэктаклях: удзел моладзі ў соцбудаўніцтве, абарона краіны, колектывізацыя, спэцыялізацыя раёнаў, аўладаньне тэхнікай, будаўніцтва пролетарскай па зьместу, нацыянальнай па форме культуры, барацьба з вялікадзяржаўным шовінізмам і шовінізмамі іншых колераў, выхаваньне новых пролетарскіх кадраў, барацьба за тарыяны Домбас і г. д.

Але тэмпы работы нашых ТРАМ аў адстаюць ад агульных тэмпаў будаўніцтва. БелТРАМ за 1931 год паставіў усяго толькі 2 п'есы, Рашэньні апошніх пленумаў ЦК УсеКП(б) і ЦК К(б)Б ТРАМ'амі яшчэ не распрацаваны і няма нават меркаваньняў аб мерапрыемствах ТРАМ аў па рэалізацыі гэтых пастаноў.

ТРАМ'ы зьяўляюцца неадлучнай часткай самадзейнага мастацкага руху, вышэйшай ступеньню самадзейнага тэатру на гэтым этапе. Масавы рух агітпропбрыгад праходзіць пад ідэйным кіраўніцтвам і пры дапамозе ТРАМ'аў. Асноўныя прынцыпы ТРАМ-руху сталі асноўнымі прынцыпамі агітпропбрыгад. Каля 10 агітпропбрыгад непасрэдна кіруюцца трамаўскімі працаўнікамі. Трамамі БССР праароблена вялікая работа па складаньню і распаўсюджваньню пролетарскіх сьпеваў, новых гульняў і скокаў. Мэтодычнае кіраўніцтва самадзейным мастацтвам ў БССР магчыма толькі пры ўдзеле ТРАМ'аў. Больш падрыхтаваных працаўнікоў у галіне самадзейнага мастацтва, акрамя трамаўцаў—па сутнасьці няма на сёньнешні дзень.

Адначасова трэба адзначыць, што ТРАМ'ы яшчэ зусім не дастаткова прымаюць удзел у кіраўніцтве самадзейным тэатрам. Методычных распрацовак няма, той вопыт ТРАМаў, які трэба скарыстаць у самадзейным мастацтве, не абагулен практычнае кіраўніцтва творчай работай зусім не дастатковае.

ТРАМ,ы адной з асноў сваей работы ставяць задачу комуністычнага выхаваньня сваіх удзельнікаў. Быць ударнікам на сваім прадпрыемстве, быць політычна сьвядомым і грамадзкім працаўніком, быць усебакова культурна разьвітым павінен кожны трамавец.

Гэты бок работы ў ТРАМ'ах БССР значна кульгае. Ня гледзячы на тое, што выкладаньне грамадазнаўства і дыялектмату ўведзена ў кожным ТРАМ'е гэтыя прадметы часта зрываюцца з-за недастаткова уважлівых адносін да іх з боку кіраўніцтва, з-за адсутнасьці сродкаў, памяшканьня для заняткаў, з-за няўменьня правільна размеркаваць час. Бытавая комуна Менскага БелТРАМ'у развалілася з-за няўмелай організацыі.

Склад ТРАМ'аў БССР—каля 80 пр рабочых каля 90 проц комсамольцаў Партыйцаў надзвычайна мала: у БелТРАМ'е—1, у яўрэйскім ТРАМ'е—3, у Віцебскім ТРАМ'е—2. Задача падвышэньня партыйнага ядра ў ТРАМ'е стаіць надзвычайна востра. Абсалютная большасьць ТРАМ'аўцаў — ударнікі на сваіх прадпрыемствах. многа брыгадзіраў.

Створаныя за гэты час трамаўскія спэктаклі: БелТРАМ—„Першы штандар" і „Трывога", Яўрэйскі ТРАМ—„Франты" зьяўляюцца пролетарскімі спэктаклямі, ня гледзячы на цэлы рад недахопаў. Уплыў на профэсыйныя тэатры БССР з боку ТРАМ'аў узмацняецца. Задача ТРАМ'аў яго павялічыць і паглыбіць асабліва па лініі крытыкі і сумесных абгаварэньняў творчых шляхоў профтэатраў і ТРАМ'аў.

Для далейшай пасьпяховай творчай работы ТРАМ'аў трэба выкрыць і дасканала абгаварыць творчыя памылкі, якія былі і часткова маюцца ў ТРАМ'аўскім руху БССР.

У БелТРАМ'е былі ўстаноўкі, якія маглі прывесьці да адмаўленьня думкі У. І. Леніна аб крытычным скарыстаньні вопыту і капітоўнасьці мінулага. Напрыклад, слаба скарыстоўваўся вопыт проф тэатру. У ТРАМ'аўскіх пастаноўках была некаторая схэматычнасьць і мэханістычнасьць („Першы штандар", „Фронты", значна менш „Трывога"). У практыцы работы былі і „лявацкія" загібы. Напрыклад, устаноўка аб удзеле ўсяго колектыву ў творчай рабоце была так прыменена ў жыцьцё, што ў Гомельскім ТРАМ'е п'есу пісалі ўсе трамаўцы» некаторыя абразкі нават ўсе па аднаму слову, у БелТРАМ'е слаба праводзіўся прынцып адзінаначальля і г. д.

Выкрыцьцё гэтых творчых памылак тармазіліся тым, што трамаўцы маюць недастатковую (агульную і політычную адукацыю, марксысцка ленінскі сьветапогляд удзельнікаў ТРАМ руху недастаткова высокі, а друк (акрамя „ЧЗ") не дапамагаў ТРАМ'ам у выкрыцьці гэтых творчых памылак.

Асноўнымі перашкодамі ў замацаваньні посьпехаў і ў далейшым разгортваньні ТРАМ'аўскага руху БССР зьяўляюцца: недаацэнка трамаў з боку цэнтральных савецкіх і профсаюзных організацый (напрыклад маюцца погляды на трамаўскі рух, як на экспэрымэнт). Вынікам гэтай недаацэнкі зьяўляецца адсутнасьць матар'яльнай базы і памяшканьняў для работ ва ўсіх ТРАМ'ах БССР да гэтага часу.

Вялікаму значэньню самадзейнага мастацтва зусім не адпавядае ўвага кіруючых організацый (профсаюзы, НКА) гэтаму руху. Дзяржаўнае кіраўніцтва самадзейным мастацтвам зусім слабае. У Наркомасьвеце няма ніводнага працаўніка па самадзейнаму мастацтву. Існаваўшы некалькі месяцаў пры НКА габінэт па самадзейнаму мастацтву зараз фактычна развален і працаўнік габінэту адпушчан на вучобу без замены. Ня гледзячы на рад пастаноў адпаведных організацый, патрабаваньняў друку, асабліва „Чырвонай зьмены", аб забясьпечаньні трамаўскага руху ў БССР, Менскія цэнтральныя ТРАМы з-за адсутнасьці сродкаў і памяшканьняў для работы ледзь не развалены і зараз працуюць бяз грошай—„на энтузіязьме".

ЦСПСБ самадзейным мастацтвам па сутнасьці ня кіруе. Па словах кіруючых працаўнікоў культсэктару ЦСПСБ—„самадзейнае мастацтва гэта толькі адна трыццатая частка нашай работы і больш ўвагі мы ўдзяліць ня можам". Склікаваная ў лістападзе г. г. першая конфэрэнцыя самадзейных мастацкіх гурткоў была падрыхтавана так дрэнна, што замест прадстаўнікоў 50 гурткоў, было ўсяго 18 дэлегатаў, нават менскія гурткі ня ведалі аб конфэрэнцыі.

Устаноўкі асобных кіруючых працаўнікоў ЦСПСБ у адносінах да ТРАМ - руху—„мы матар'яльна ТРАМ-руху дапамагаць ня будзем і забаронім гэта заўкомам, бо ТРАМ рух разгортваецца ў сыстэме комсамолу і наогул няма дэрэктывы з УсеЦСПС",—прыводзілі да таго, што напрыклад фабком „Сьцяг індустрыялізацыі" (Віцебск) адмовіў фабрычнаму ТРАМ-ядру ў выдачы для афармленьня выступленьняў 10 руб., у той час, як за пару месяцаў было выдаткавана некалькі тысяч рублёў на колектыўнае наведваньне рабочымі тэатраў.

3-ці кантрольны пленум ЦК ЛКСМБ (ліпень 1931 году) прыняў па дакладу т. Рубінчыка аб ходзе выкананьня рашэньняў зьездаў па ўдзелу ЛКСМБ у нацкультбудаўніцтве. пастанову, у якой у адносінах да ТРАМ-руху было запісана:" у галіне перабудовы мастацтва ў сапраўды пролетарскае, комсамол мае значныя дасягненьні, якія выражаюцца ў стварэньні ТРАМаўскага руху. Практычная работа БелТРАМу паказала, што ТРАМ, будучы формай новага тэатру.—здолен адыграць аграмадную ролю ў падпарадкаваньні мастацтва задачам соцыялістычнага будаўніцтва, але гэта органамі НКАсьветы і ЦСПСБ не прызнана, ТРАМаўскі рух зараз стаў такім аб'ектам на тэатральным фронце, вакол якога групуюцца погляды, што адбіваюць правільную партыйную лінію ў пытаньнях мастацтва і погляды, якія цягнуць мастацтва назад, іх можна кваліфікаваць як правыя погляды, правыя плыні ў мастацтве. Выходзіць гэта таму, што ТРАМ сапраўды зьяўляецца перадавым атрадам комсамолу на фронце мастацтва.

Пленум адзначае, што для работы ТРАМаў складзена недапушчальная абстаноўка (недапуск сродкаў і памяшканьня). Гэта абстаноўка тармозіць разгортваньне ТРАМаўскага руху і ставіць старэйшы у БССР—Беларускі ТРАМ пад пагрозу развалу. Асабліва недапушчальныя адносіны да ТРАМаў з боку НКА і ЦСПСБ.

Пленум патрабуе ад ЦСПСБ і НКА поўнага падтрыманьня ТРАМаўскага руху „не на словах а на справе".

Трэба адзначыць, што такога пералому ў адносінах да трамаўскага руху, які забясьпечваў-бы пасьпяховае разгортваньне ТРАМаў, па сутнасьці яшчэ няма.

У Крупках на фрон загатовак—зацішша

Узьняць тэмпы! Здаць хлеб дзяржаве поўнасьц і ў тэрмін

Колгасны сэктар адстае

Крупкі. 5—XII (Белта). Загатоўкі збожжа ў Крупскім раёне не вядуцца патрэбнымі тэмпамі. Апошняя пяцідзёнка лістапада дала прырост толькі на 3,8 проц.; плян выкананы на 64 проц. Прычына адставаньня: слаба працуюць загатоўчыя організацыі, райснаб опэрацыйна ня кіруе загатоўкамі. Масавая праца з колгасьнікамі і бядняцка - серадняцкімі аднаасобнымі гаспадаркамі ў радзе с-саветаў не разгорнута.

У некаторых с-саветах апошняя пяцідзёнка не дала прыросту (Бобрыцкі, Крупскі местсавет, Ухвальскі, Слабодзкі і Шынкаўскі). На кулацка-заможныя элемэнты няма націску ў большасьці с-саветаў. За апошнюю пяцідзёнку кулакі і заможнікі здалі ўсяго 18 цэнтнэраў што складае 0,2 проц. агульнага заданьня. Агульны цант выкананьня загатовак цьвёрдых заданьнях—47,7. гасны сэктар на 1-е сьнежня 55,5 проц.

Грамадзкасьць колгасаў не лізавана на сваячасовае і ўда правядзеньне загатовак. Аса гэта кідаецца ў вочы калі пры пад увагу, што аднаасобны бядня серадняцкі сэктар выканаў на 98,4 проц. Тое самае і з б бай: раён выканаў заданьне 65,33 проц.

Падання факты выклікаюц абходнасьць з усёй катэгорычн цю патрабаваць, каб загатоў організацыі с-савету тэрмінова рабудавалі сваю працу. Кру раён мае ўсе магчымасьці сва сова выканаць дырэктывы апош га пленуму ЦК КП(б)Б.

Плян збожжазагатовак выканан на 120 проц.

ПОЛАЦАК. Сваячасова падрыхтаваўшыся да збожжазагатоўчай кампаніі, колгас „Чырвоны араты", Сястронскага с-савету, поўнасьцю і ў тэрмін выканаў плян. Плян загатоўкі жыта, аўса, ячменю перавыканан на 20 проц.

Цяпер колгас пераключыўся на апрацоўку і здачу лёну дзяржаве.

Мікола Віленскі.

Пакінулі фронт загато

Плян збожжазагатовак у шчынскім с-савеце Слуцкага ра —пад пагрозай: на 25-XI выка толькі на 14,9 проц., а па цы дых заданьнях на 3,6 проц.

Комсамольская ячэйка ні ўдзелу ў збожжазагатоўчай кам віі ня прымае. Райком ЛКС павінен забясьпечыць выкан пляну загатовак, прыцягнуўшы адказнасьці комсамольцаў, якія руюць гэтую работу.

С. Станкевіч

Раўняцца па калгасу „1-е мая."

ЗАСЛАЎЕ, 5-XI. Колгасьнікі „1-га Мая" Рагоўскага с-савету, па ўдарнаму і ў самы карэткі тэрмін выканалі ўса нарыхтоўкі. Колгасьнікі дабіліся гэтага правільнай расстаноўкаю сіл, увядзеньнем зьдзельшчыны і брыгаднага мэтаду працы, вылучэньнем ударнікаў для апрацоўкі ўсіх відаў загатовак.

Колгасьнікі перайшлі на начную малацьбу і к 28 лістапада закончылі яе. Зараз колгас выканаў заданьне: па збожжу на 100 проц., па бульбе на 106 проц., ільнанасеньню на 100 проц., ільнавалакну на 100 проц., канопляx на 100 проц. Калгасу не было заданьня па мясу, колгасьнікі высунулі сустрэчны і здалі 450 кгр. Калгас „1 мая" павінен быць прэміраваны.

БЕЛТА.

„Зрабіць нічога ня можам, бо сталоўка гарадзкая"

Будвуч БЖС харчуецца ў сталоўцы № 14. Абеды дрэнныя. Загадчык сталоўкі тлумачыць гэта тым, што аддзел харчаваньня не адпускае продуктаў, у выстарчальнай колькасьці.

Па думцы сэкратара комсамольскай ячэйкі, для палепшаньня якасьці абедаў нічога зрабіць нельга, бо гэта сталоўка агульна-гарадзкая.

Такія разважаньні сэкратара гавораць аб бязьдзейнасьці комсамольскай організацыі ў рэалізацыі пастаноў апошняга пленуму ЦК УсеКП(КП(б)Б аб грамадзкім харчаваньні.

Уключыць у працу комсамольс організацыі конкрэтную барацьбу палепшаньне харчаваньня фабзаў нікаў—тэрміновая задача.

Брыгада „Ч. З."
Арапоўская, Казлов

Адказны рэдактар Л. Перліна

Па тэхнічных прычынах ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ НА 2-х СТАРОНКАХ

Старонка фабзавучніка ВЫЙДЗЕ ЗАЎТРА

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна. Упаўнаважаны Галоўлітбелу №А—2522.